**ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за красавік 2023 г.

## <u>Мерапрыемствы ў рамках тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі</u>

**1 красавіка**

Бібліятэкар Астроміцкай публічнай бібліятэкі правяла займальную праграму «Апрельская юморина». Мерапрыемства прайшло для атрадаў «Сябры» і «Васількі» прышкольнага лагера. Дзеці ўдзельнічалі ў конкурсах «И мы тоже», «Пантамима», «Перевёртыши», «Дизайнер». Весела і займальна прайшлі спаборніцтвы дэтэктыўных агенцтваў «Весёлые зонтики» и «Крабы в супе». Удзельнікі паспрабавалі сябе ў інтэлектуальнай віктарыне «Вопросы – шутки», у музычным конкурсе самыя творчыя хлопцы выканалі прыпеўкі. У канцы мерапрыемства ўсіх удзельнікаў праграмы чакалі салодкія пачастункі.

Астроміцкая ПБ, 30 чал.

**3 красавіка**

Бібліятэкар правяла свята дзіцячай кнігі «Книга дарит чудеса». У праграме свята - выстава-прагляд дзіцячай літаратуры «Радость дарит любимая книга», прысвячэнне першакласнікаў Тевельской школы ў чытачы, уручэнне ім медалёў «Я - читатель библиотеки». Гульнявая праграма «Двери в сказку отвори» дапамагла юным чытачам акунуцца ў чароўны свет кнігі. Дзякуючы пастаноўцы «Гришкины книжки» дзеці ўспомнілі, як трэба ставіцца да кніг. Цікавасць у дзяцей выклікалі музычныя нумары паміж конкурсамі, якія дарылі ўдзельнікі дзіцячага вакальнага гурта клуба.

Тэвельская ПБ, 28 чал.

**4 красавіка**

У бібліятэцы Дзень казкі «Добрая сказка в кругу друзей» прайшоў пад дэвізам «Читай больше – стремись к лучшему». Вучні СШ №8 2 «Д» класа прынялі ўдзел у гульнёвай праграме «Только книгу открываешь в сказку сразу попадаешь», у квэст-гульні «Сказки со мною повсюду, их никогда не забуду». У пакоі казак дзеці паглядзелі лялечны спектакль «Жадная ежиха».

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 35 чал.

**5 красавіка**

Падчас віртуальнага падарожжа, прысвечанага Міжнароднаму дню лялечніка «Тэатр лялек – казачная краіна», бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з гісторыяй лялечнага тэатра і свята Дня лялечніка. Расказ дапоўніла прэзентацыя «Тэатр лялек – казачная краіна». Апошнім акордам мерапрыемства стаў міні–спектакль па рускай народнай казцы «Рэпка», дзе дзеці самі сталі ўдзельнікамі. Лукская ПБ, 21 чал.

**Мерапрыемствы да Дня яднання Беларусі і Расіі**

**2 красавіка**

У філіяле «Дзівінская публічная бібліятэка» адбыўся патрыятычны час «Дзве краіны - адзін лёс». Падчас мерапрыемства дзеці пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення свята, сімваламі дзяржаўнасці Беларусі і Расіі. Паглядзелі відэапрэзентацыю «Нас родніць векавая гісторыя», якая пазнаёміла з гісторыяй шматпланавага супрацоўніцтва дзвюх краін – суседак. Дзеці выконвалі песні і чыталі вершы Я. Коласа, Э. Асадава, М. Танка. Бібліятэкар правяла агляд ля кніжнай выстаўкі «Адзінства народа – нязломная крэпасць».

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 26 чал.

**4-5 красавіка**

Адбыўся цыкл масавых мерапрыемстваў, прысвечаных Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, удзельнікамі якога сталі навучэнцы УА «Кобрынскі дзяржаўны палітэхнічны каледж», ДУА «Сярэдняя школа № 1», падапечныя ДУ «Кобрынскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва» і ДУ «Кобрынскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў». У цыкл масавых мерапрыемстваў увайшлі: урок садружнасці «Беларусь и Россия: общая история, общая судьба», інфармацыйная гадзіна «Особый день в судьбе народов Беларуси и России», патрыятычны час «Братство народов: Беларусь и Россия». Вядучыя расказалі аб стварэнні супольнасці Беларусі і Расіі, падпісанні Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, аб дзяржаўных сімвалах, літаратуры, славутасцях, культурных традыцыях, якія садзейнічалі развіццю сяброўскіх адносін паміж дзвюх брацкіх славянскіх дзяржаў.

Прысутныя прынялі актыўны ўдзел у інтэрактыўнай віктарыне «Что роднит народы Беларуси и России?». Мерапрыемствы суправаджаліся праглядам відэапрэзентацыі «Сильны единством».

ЦРБ, 98 чал.

**Мерапрыемствы да Сусветнага Дня здароўʼя**

**7 красавіка**

У бібліятэцы прайшла пазнавальная гадзіна «Путешествие в страну здоровья» для навучэнцаў Дзівінскай школы. Дзеці ўспомнілі правілы асабістай гігіены, пагаварылі пра рэжым дня, пра правільнае харчаванне і пра іншых фактары здаровага ладу жыцця, успомнілі народныя прыказкі і прымаўкі. Потым дзеці разгадвалі загадкі, ўдзельнічалі ў віктарыне «Интересно о полезном». Арганізавана кніжная выстава «Прочти для своего здоровья».

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 23 чал.

**7 красавіка**

Бібліятэкар Батчынской публічнай бібліятэкі арганізавала квэст-гульню «По дороге к доброму здоровью». Камандзе трэцякласнікаў патрэбна было

прайсці 8 станцый. На кожным этапе за выкананне заданняў удзельнікі атрымлівалі адну з частак пазла, які павінен быў ператварыцца ў дэвіз. здаровага ладу жыцця. Дзеці наведалі станцыі «Мы за ЗОЖ», «Правильное питание», «Что, где, почему?», «Народная медицина», «Первая помощь», дзе адказвалі на пытанні, аказвалі першую дапамогу, збіралі прыказкі пра здароўе, паказвалі свае веды пра віды спорту.

Батчынская ПБ, 27 чал.

**7 красавіка**

У рамках праекта «Библиотека без границ» у інфармацыйна-сэрвісным цэнтры для падапечных аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзянаў сталага веку Кобрынскага ТЦСАН адбылася інфармацыйна-пазнавальная гадзіна «Спорт в жизни великих». Пра спартыўныя дасягненні пісьменнікаў запрошаныя пазналі з прагляду відэароліка «Спортивный досуг писателей». Госці расказалі, якімі відамі спорту яны займаюцца.

ЦРБ, 16 чал.

**<u>Мерапрыемствы да 37-годдзя аварыі на Чарнобыльскай АЭС</u>**

**26 красавіка**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры цэнтральнай раённай бібліятэкі для навучэнцаў СШ № 1 г. Кобрына і УА «Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж» прайшлі мерапрыемствы: вечар памяці «Чернобыль в памяти и книгах» і патрыятычны час «Чернобыльская трагедия: как это было».Бібліятэкары расказалі прысутным аб мужнасці і гераізме людзей, якія прымалі ўдзел у ліквідацыі наступстваў аварыі, аб страшных захворваннях, звязаных з уплывам радыёактыўных рэчываў. Навучэнцы даведаліся пра гістарычныя факты Чарнобыльскай катастрофы, як адбылася аварыя, прасачылі храналогію падзей выбуху на атамнай электрастанцыі. Праведзены агляд кніг «В память о Чернобыле».

Мерапрыемствы, якія суправаджаліся праглядам відэапрэзентацыі «Последствия Чернобыля – боль всей планеты», праводзіліся ў рамках маладзёжнага патрыятычнага праекта «Беларусі роднай славутыя крокі».

ЦБ, 62 чал.

**27 красавіка**

ДА 37-годдзя Чарнобыльскай аварыі прысвечана літаратурна - музычная кампазіцыя «Не згасае памяці свечка», падрыхтаваная Залескай публічнай бібліятэкай сумесна з Залескай СШ і ЦКД.

Прысутныя прыгадалі трагічныя падзеі вясны 1986 г., людзей, якія коштам уласнага жыцця спрабавалі выратаваць свет, разам шукалі адказ на пытанне: што трэба зрабіць, каб не паўтарыўся Чарнобыль? Мерапрыемства суправаджалася праглядам відэапрэзентацыі «Падарваны красавік» і кніжнай выстаўкі «Чарнобыль: вечная памяць і вечны боль».

Залеская ПБ, 68 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**10 красавіка**

Літаратурны экспрэс «Удивительный маршрут» адбыўся па старонках зборнікаў кобрынскіх паэтаў. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі і кіраўнік клуба «ПоэтиКо» Наталля Кандрашук разам з Зінаідай Навасад і Марынай Міхалюк прапанавала дзецям здзейсніць вандроўку, зрабіўшы паэтычныя прыпынкі на станцыях «Дорожная», «Игровая», «Загадочно-математическая». Удзельнікі мерапрыемства адгадвалі загадкі, чыталі галаваломкі, гулялі, знаёміліся з паэтычнай творчасцю гасцей. Потым госці ўрачыста прынялі першакласнікаў у чытачы, а лепшым чытачам 2-4 класаў уручылі дыпломы «Читай-ка». Арганізавана выстава «Читающие дети – умнее всех на свете».

Залеская ПБ, 58 чал.

**10 красавіка**

Аматарскі клуб «Родник» запрасіў навучэнцаў старэйшых класаў, настаўнікаў і жыхароў в. Залессе на чарговыя духоўна-асветніцкія чытанні «Перадвелікодны тыдзень». Слухачам прапанавалі задумацца пра падзеі апошняга тыдня перад Вялікднем, пра значэнне кожнага дня сядміцы. Члены клуба паказалі, як гэта тэма адлюстравана ў паэзіі А. Пушкіна, А. Ахматавай, А. Пляшчэева, В. Брусава і інш. У мерапрыемстве прыняў удзел протаіерэй храма святых апосталаў Пятра і Паўла Кіслюк Сергій Аляксеевіч. Падрыхтавана прэзентацыя і выстава літаратуры «Путь покаяния».

Залеская ПБ, 42 чал.

**13 красавіка**

Для навучэнцаў старэйшых класаў СШ №1 г. Кобрына ў інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшла вечарына ўспамінаў «С болью в сердце вспоминая…». Прысутныя пазнаёміліся з трагічнымі падзеямі Другой сусветнай вайны, з гісторыяй узнікнення Міжнароднага дня вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў, з канцлагерамі, якія атрымалі асаблівую сумную вядомасць: Азарычы, Асвенцым, Трасцянец, Дахау, Саласпілс, Бухенвальд, Майданек. У гэты дзень гучалі паэтычныя творы пра страшныя гады вайны і вязняў канцэнтрацыйных лагераў.

Мерапрыемства суправаджалася праглядам відэапрэзентацыі «Жизнь за колючей проволокой».

ЦБ, 34 чал.

**18 красавіка**

Батчынская публічная бібліятэка сумесна з Домам культуры правялі фальклорную праграму «З любоўю і ласкай сустракаем Вялікдзень». Дзеці даведаліся, як здаўна на Русі было прынята сустракаць Вялікдзень, аб гульнях і карагодах, аб велікодным стале: кулічах, стравах, фарбаваных яйках. Дзеці адказвалі на пытанні віктарыны, распавядалі, як у іх у сям'і

праходзіць свята, удзельнічалі ў велікодных гульнях: «Схапі яйка», «Хто сказаў яйка», «Намалюй яйка», «Гарачае яйка».

Батчынская ПБ, - 63 чал.

**20 красавіка**

Інфармацыйна-пазнавальная гадзіна «По следам великих женщин» адбылася ў рамках маладзёжнага патрыятычнага праекта «Беларусі роднай славутыя крокі» для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Госці даведаліся пра жыццё, навуковыя і творчыя дасягненні знакамітых суайчынніц: князёўны Рагнеды, Е. Полацкай, Н. Слуцкай, каралевы Барбары Радзівіл, каралевы Бона Сфорца д'Арагона.Навуковы супрацоўнік Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава Наталля Фрыдлендэр расказала пра лёсы знакамітых жанчын, якія паўплывалі на ход гісторыі Кобрына. Сярод іх: княгіня Вольга Раманаўна, Ганна Ягелонка, дачка Боны Сфорцы, кобрынская князёўна Ганна, скульптар, педагог і паэт Бальбіна Свіціч-Відацкая, кобрынская падпольшчыца Аліса Данілеўская. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэаролікаў «Путь Евфросинии Полоцкой», «О жизни Боны Сфорца» і відэапрэзентацыяй «Знаменитые женщины в истории Кобрина».

ЦБ, 32 чал.

## <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

**5 сакавіка**

У Год міру і стварэння бібліёграфы цэнтральнай бібліятэкі прапанавалі фотарэпартаж «Вялікі спіс крывавы», прымеркаваны да 80-й гадавіны Хатынскай трагедыі. Фотарэпартаж «Вялікі спіс крывавы» прадстаўлены ў выглядзе набору паштовак з інфармацыяй (на беларускай і рускай мовах) аб вёсках Кобрынскага раёна, якіх напаткаў трагічны лёс Хатыні.

**20 красавіка**

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу выдадзены зборнік вершаў «Кококор» Міхала Чайникова – кобрынскага паэта, члена народнага аматарскага аб'яднання «Белый аист» і літаратурнага клуба «ПоэтиКо». Выданне складаецца з 66 аўтарскіх твораў і прызначана ўсім знатакам паэзіі.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3-85-81